нечном итоге это и определит будущее значительного количества рабочих поселков республики.

*Литература:*
*1. Морозова, Е.Б. От промышленного поселения до технопарка: территориальные объекты промышленной архитектуры / Е. Б. Морозова. – Минск : БНТУ, 2014. – 208 с.*
*2. Алешин, В. Э. Теория и практика градостроительства на Украине в первые годы советской власти (1917–1925) / В. Э. Алешин // Советское градостроительство 1920–1930-х годов: Новые исследования и материалы: сб. ст. / сост. и отв. ред. Ю. Л. Косенкова. – М .: Либроком, 2010. – 384 с.*
*3. Белорусский государственный архив научно-технической документации. – Ф. 3. Оп. 4. Д. 3. Л. 35.*

УДК 72.04+711.01

Ю. Т. Шэстак
магістр архітэктуры,
ТАА «АнТанаСтрой»

## АРХІТЭКТУРНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ ЎВАХОДАЎ У ГАНДЛЁВЫЯ ЎСТАНОВЫ XIX – ПАЧАТКУ XX СТСТ.
## ARCHITECTURAL ARRANGEMENT OF ENTRANCES OF SHOPS IN 19TH – EARLY 20TH CENTURY

*Анатацыя: Артыкул разглядае спецыфіку арганізацыі ўваходных вузлоў у крамы на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX стст. Асобная ўвага надаецца ролі і класіфікацыі дзвярных ваканіцаў.*
*Abstract: The article considers the particular design features characteristic of arranging the entrance units of shops in Belarus in the in the second half of the 19th cen. to the early 20th cen. Special attention has been paid to the use and classification of the doors shutters.*
*Ключавыя словы: дзверы, дзвярны праём, запаўненне, ваканіцы, фасад, крама, увахад.*
*Keywords: door, door aperture, assembly unit, shutters, facade, shop, shop entrance arrangements.*

У другой палове XIX – пачатку XX стст. на тэрыторыях сучаснай Беларусі адбываўся хуткі рост колькасці ўстановаў гандлю і паслугаў. Большасць крам і лавак займала памяшканні невялікай плошчы 2–6 м² [1, с. 102–103]. Такія дробныя ўстановы шчыльна размяшчаліся на перыферыйных гандлёвых вуліцах, часам фарміруючы цэлыя раёны. Напрыклад, у Мінску існавала частка горада з навай “Цёмныя крамы”. Гэты тапонім паходзіў ад вялікай колькасці крамаў без вокнаў, адсутнасць якіх была абумоўлена недастатковай унутранай прасторай. Першы паверх будынкаў тут выглядаў як шэрагі дзвярэй, якія на ноч дадаткова зачыналіся ваканіцамі. Троху большыя крамы маглі мець вакно, якое таксама прычынялі ваканіцамі. Адносна невялікая частка тагачасных установаў гандлю і паслугаў адносілася да класы фешэнэбельных, адпаведна з комплексна распрацаванымі ўваходамі, вітрынамі і шыльдамі, то бок з аздобай усёй часткі фасада, якая належала да крамы, рэстарацыі, цырульні і г.д. Захаваўся праект Мінскага гарадскога тэхнічна-будаўнічага і чарцёжнага бюро па афармленню крамы М. С. Шабадта (пач. XX ст.), на якім бачна, як размяшчэнне праёмаў, дзвярныя і вaконныя запаўненні і абшыўка мура ўтвараюць канструкцыйна і кампазіцыйна адзіную сістэму. Гаспадары такіх дарагіх установаў маглі дазволіць сабе наймаць ахоўнікаў, і не прыбягаць да выкарыстання ваканіцаў.

Выбар тых або іншых ваканіц, дзвярэй і вокнаў, як і іншых элементаў уваходнага вузла, часцей за ўсё залежаў ад гаспадара крамы. Такім чынам, на адным фасадзе магло спалучацца

некалькі відаў запаўненняў аднаго тыпу адначасова. Часам за аздабленне ўваходаў адказваў уласнік будынка, які здаваў памяшканні ў арэнду. У большай ступені гэта тычылася гандлёвых радоў. У будынку Старой ратушы ў Гродна ў 20-х гг. XX ст. бачны шэраг аднастайных дошкавых звонку ваканіцаў, якія пры расчыненні аказваюцца прафіліраваннымі філянговымі, г.зн. дошкава-філянговымі. Такі маскіровачны прыём даваў дадатковую засцярогу ад злодзеяў уначы. Наяўнасць дошкава-філянговага канструкцыйнага тыпу з'яўляецца **характэрнай асаблівасцю ваканіцаў у адрозненне ад дзвярэй**, разам з трыма іншымі адметнасцямі: ваканіцы маглі быць металічнымі, не мелі светлавых адтулін, якія аслаблялі б трываласць палотнаў, і ніколі не мелі каробкі. Трэцяе адрозненне палягала ў тым, што дзверы адчыняліся ўнутр памяшкання, а ваканіцы на вуліцу. Гэта было абумоўлена функцыянальнымі задачамі: такое іх размяшчэнне дазваляла гаспадару крамы раніцай адчыняць з сярэдзіны дзверы, а затым ваканіцы, якія расхіналісяаднойчы і на ўвесь дзень мацаваліся да фасада, а дзверы адчыняліся пры патрэбе. Такім чынам, ні першыя, ні другія не заміналі рухацца пешаходам на вузкіх ходніках тагачасных гандлёвых вуліц.

Варыянты **спалучэння дзверы-ваканіцы** выглядаюць наступным чынам: дошкавыя дзверы могуць дапаўняцца дошкавымі або металічнымі ваканіцамі, філянговыя дзверы – дошкавымі, філянговымі або дошкава-філянговымі. Варыянты **спалучэння дзверы-вакно-ваканіцы** маглі рэалізоўвацца ў выглядзе асобна размешчанага вакна са сваімі ўласнымі ваканіцамі, або як вакно, канструкцыйна злучанае з дзвярыма, як пераходны варыянт да комплекснай вітрыны. Тады адна ваканіца закрывала дзвярны праём, а другая сіметрычна ваконны (Мал. 1).




Мал. 1. Складнікі ўваходнага вузла ў гандлёвых установах XIX – пачатку XX стст.

**Варыянты закрывання ваканіцамі ўваходнага праёма і фрамугі** залежаць ад наяўнасці апошняй і вышыні створак. Дзвярны праём без фрамугі заўжды захінаецца ваканіцамі цалкам. Дзвярны праём з фрамугай можа прычыняцца цалкам або такім чынам, каб пакідаць фрамугу адкрытай. У апошнім выпадку фрамуга перасоўваецца з плашчыні дзвярэй у плашчыню фасада і ваканіц.

Ваканіцы падзяляюцца па наступных прыкметах: **матэрыял выканання, канструкцыя створкі, колькасць створак**. Па матэрыяле выканання ваканіцы былі драўлянымі (большасць), або металічнымі. Драўляныя палотны мелі дошкавую, філянговую або дошкава-філянговую (дошкавы слой звонку) канструкцыю, металічныя маглі быць зроблены з аднога ліста жалеза кожнае, або набраны з некалькіх кавалкаў. Паводле колькасці палотнаў створка была або суцэльнай (у гэтым выпадку створка тоесная палатну), або складной (створка складаецца з некалькіх палотнаў). Суцэльная створка расчынялася навонкі, і захінала сабой шырокі кавалак фасада, што было ня зручным у выпадку блізкага размяшчэння некалькіх праёмаў. Зрэдзьчасу гэту праблему вырашалі простым "наслойваннем" ваканіц аднаго праёма на ваканіцы суседняга (Старая ратуша ў Гродна) і іх змацаваннем паміж сабою. Звычайна гэта былі ваканіцы праёмаў адной установы. Для

эканоміі месца звычайна выкарыстоўваліся складныя створкі, у большасці выпадкаў з двума роўнымі палотнамі, якія адпаведна займалі ўдвая меншую шырыню. Металічныя ваканіцы маглі аднак складацца з большай колькасці палотнаў, утвараючы літаральна падабенства гармоніка. Створкі з няроўнымі палотнамі сустракаліся радзей. Яны дазвалялі не змяшчаць ваканіцы ва ўзроўні фасада, а заглыбіць у адхонах для дадатковай абароны ад атмасферных ападкаў. Тады меншае палатно "клалася" на плашчыню адхона, візуальна ствараючы яму драўляную аздобу, а большае расхіналася, як звычайна, на фасад (як у краме "Вольга" ў Мінску).

**Архітэктурна-мастацкае аздабленне** ваканіц залежала ў першую чаргу ад выбару дошкавай або філянговай канструкцыі, і прадстаўляла з сябе простыя варыянты дзвярнога дэкора для кожнага з гэтых тыпаў. Для дошкавых ваканіц гэта шалёўка і роспісы, а для філянговых – дзяленне на панэлі, прафіліраванне краёў філёнгаў, накладанне прафіліраваных брускоў, роспісы. Металічныя ваканіцы звычайна не ўпрыгожваліся, але бачныя на іх паверхні канструктыўныя дэталі (завесы, петлі, абвязка перыметра палатна, раскляпаныя шапкі цвікоў) валодалі патэнцыялам ствараць своеасаблівы рытм і малюнак. Архітэктурна-мастацкае аздабленне дзвярэй і вокнаў было разнастайнейшым і выкарыстоўвала фактычна поўны пералік адпаведных запаўненню дэкаратыўных прыёмаў.

Адметным відам архітэктурна-мастацкага аздаблення ўстановаў гандлю і паслугаў можна лічыць наяўнасць **рэкламных сродкаў**, якія маглі быць кампазіцыйна ўвязаныя або не ўвязаныя з агульным вырашэннем увахода, то бок размяшчацца па тэктанічным або атэктанічным прынцыпе. Рэкламная шыльда над уваходам звычайна гарманічна ўпісвалася ў афармленне фешэнэбельных крамаў і рэстарацый, для гэтага ёй прызначалі месца яшчэ на стадыі праекта. У выпадку з бяднейшымі ўстановамі рэкламныя канструкцыі размяшчаліся больш адвольна. У цэлым, сродкі вонкавай рэкламы адрозніваліся вялікай разнастайнасцю, выразна ўплываючы на воблік гандлёвых вуліц. Найбольш распаўсюджанымі былі тэкставыя паведамленні, шыльды з надпісам і выявай прадметаў гандлю, асобна зробленыя выявы гэтых прадметаў, а таксама роспісы, якія маглі быць даволі прымітыўнымі, а маглі валодаць высокай мастацкай каштоўнасцю [2]. Адметнай рысай гандлёвых вуліц было размяшчэнне рэкламных паведамленняў на паверхні ваканіц. Адпаведна, у непрацоўны час такая рэклама зачынялася разам са створкай і лепш захоўвалася.

Сёння ў Беларусі па шэрагу прычын засталіся адзінкавыя прыклады металічных дзвярных ваканіцаў гандлёвых установаў, хаця гэтыя элементы ўваходаў шырока ўжываліся яшчэ да 1941 г. У комплекс краязнаўчага музея ў Івянцы Валожынскага раёна ўключана былая габрэйская лаўка з дзвярыма і вакном з ваканіцамі. На цэнтральнай плошчы ў Куранцы Вілейскага раёна захаваўся шэраг будынкаў з ваканіцамі. Гэтыя крамы да нядаўняга часу яшчэ выкарыстоўваліся па першасным прызначэнні. У суседніх краінах таксама можна знайсці ўзоры працяглага выкарыстання аўтэнтычных элементаў уваходаў у гандлёвыя ўстановы. Напрыклад, многа крам з металічнымі ваканіцамі дагэтуль працуе ў віленскім Старым горадзе. На іншых вуліцах Вільнюса, прылеглых да цэнтра, пры аднаўленні будынкаў часам выкарыстоўваецца такі прыём, калі адна вялікая ўстанова звонку аформлена як некалькі дробных крамаў (Мал. 2). У цэлым, выкарыстанне традыцыйнага формаўтварэння арганізацыі ўваходаў мае вялікі патэнцыял для рэканструкцыі вобліку гістарычных гандлёвых вуліц і асобных будынкаў.



Мал. 2. Вільнюс. Сучаснае выкарыстанне традыцыйнага формаўтварэння.

*Літаратура:*
*1. Церашкова, К. С. Мяшчане ў сацыяльна-эканамічным развіцці беларуска-літоўскіх губерняў (1861–1914 гг.) / К. С. Церашкова. – Мінск : Беларуская навука, 2018. – 314 с.*
*2. Шэстак, Ю. Т. Вонкавая рэклама і ўваходы на гандлёвых вуліцах другой паловы XIX – пачатку XX стагоддзяў / Ю. Т. Шэстак //Архитектура. Сб. науч. тр. – Вып. 15 ; редкол. : А. С. Сардаров [и др.]. – Минск : БНТУ, 2022. – С. 131–136.*

УДК 728.1(513.21)

Юэян Чжан,
аспирант,
Белорусский национальный технический университет

## ИССЛЕДОВАНИЕ НАРОДНОЙ ЖИЛОЙ АРХИТЕКТУРЫ ЮНЬНАНИ
## YUNNAN ETHNIC RESIDENTIAL BUILDINGS RESEARCH

*Аннотация: Систематизируя существующую литературу по традиционной жилой* архи*тектуре в провинции Юньнань, статья раскрывает новую тенденцию исследований региональной архитектурной культуры Китая и предоставляет основные доказательства и направления для последующих исследований архитектурной культуры жилища в провинции Юньнань.*
*Abstract: Systematizing the existing literature on traditional residential architecture in Yunnan Province, the article reveals a new trend in the research of China's regional architectural culture and provides the main evidence and directions for further research of the architectural culture of housing in Yunnan Province.*
*Ключевые слова: этническая архитектура, региональная культура, исследования литературы.*
*Key words: ethnic architecture, regional culture, literature studies.*

Юньнань имеет разнообразную природную среду и культуру различных этнических групп, имеющих определенные различия. Поэтому в Юньнани было создано множество этнических архитектурно-художественных стилей со своими особенностями. Региональность, разнообразие и богатство самой этнической архитектуры Юньнани, а также многодисциплинарность в области исследований дают направления для выявления и изучения документов, и в то же время пересечение нескольких дисциплин создает и определенные трудности при изучении этих же документов. К тому же, поскольку Юньнань расположена на границе Китая, то в книгах по истории архитектуры и древней архитектурной классике, соответствующая информация относительно редка.